А. А. Гаравая. Навукова-даследчая дзейнасць філолагаў ВНУ і НДУ Беларускай ССР (1944—1961 гг.)/. Гаравая А.А. // Российские и славянские исследования: Сб. науч. статей. Вып. 5 /Редкол.: О. А. Яновский (отв. ред.) и др. — Мн.: БГУ, 2010. — С.101–105.

**А. А. ГАРАВАЯ**

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ФІЛОЛАГАЎ ВНУ І НДУ БЕЛАРУСКАЙ ССР (1944—1961 гг.)

Пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны аднаўленне народнай гаспадаркі і культуры патрабавала хуткага наладжвання падрыхтоўкі разнастайных спецыялістаў. Вышэйшая школа Беларусі павінна была не толькі ўзнавіць свае даваенныя колькасныя маштабы, але і грунтоўна пераасэнсаваць накірункі дзейнасці, стварыць і рэалізаваць новыя вучэбныя планы. Ставілася задача задаволіць краіну ў спецыялістах, якія б маглі спалучаць веды з тагачас-ным узроўнем навукі. Такі падыход меў месца і да філалогіі, якая, да таго ж, успрымалася не толькі як сродак павышэння пісьменнасці насельніцтва і яго агульнай культуры, але і як адзін з шляхоў ідэалагічнага ўздзеяння на «масы».

Вядучую ролю ў аднаўленні і развіцці філалогіі ў БССР адыгрывала рэспубліканская Ака-дэмія навук. Яна вызначала накірункі і каардынавала навукова-даследчую работу ў ВНУ, якая лічылася абавязковым складнікам дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу. Спецыфіка працы Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва, а потым асобных Інстытута мо-вазнаўства і Інстытута літаратуры мела свае асаблівасці ў параўнанні з ВНУ. Але ўзаема-ўплыў быў характэрны для стасункаў ВНУ і акадэмічных інстытутаў філалагічнага профілю.

Перад савецкай вышэйшай школай ставіліся задачы аднаўлення і пашырэння сеткі ВНУ, аднаўлення даваеннага кантынгенту студэнтаў ВНУ і падрыхтоўкі з іх спецыялістаў-педаго-гаў для сярэдніх школ. Гэтыя задачы маглі вырашацца толькі пры наяўнасці высокакваліфі-каваных выкладчыкаў ВНУ і адпаведнай навуковай і вучэбна-метадычнай базы. Як свед-чаць дадзеныя архіваў, матэрыяльная база значнай колькасці педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў і ў 1947 г. заставалася нездавальняючай: інстытутам па-ранейшаму не хапала вучэбных плошчаў, інтэрнатаў, вучэбна-лабараторнага абсталявання. Шэраг педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў быў не забяспечаны кваліфікаванымі кадрамі прафесарска-вык-ладчыцкага саставу. Міністэрства асветы дапускала да чытання самастойных курсаў вык-ладчыкаў, якія самі толькі што скончылі педінстытуты і не мелі навукова-практычнага вопы-ту работы ў ВНУ [1, арк. 144]. Да таго ж і навукова-метадычная база ВНУ рэспублікі была вельмі нізкай. Так, кніжны фонд бібліятэк ВНУ БССР у пачатку 1950-х гг. прыкладна на 22 % складаўся з літаратуры філалагічнага профілю. Але пры гэтым на пачатак 1952 г. у беларускіх ВНУ адсутнічалі падручнікі па беларускай мове і літаратуры [2, арк. 39]. Міністэрства асветы прымала дапамогу ад маскоўскіх ВНУ, але і само арганізоўвала (праўда, пад кантролем з Масквы) навукова-метадычныя распрацоўкі сваіх, беларускіх, падручнікаў і дапаможнікаў.

Відавочна, што адна АН БССР не была ў стане вырашыць усе задачы, якія ўскладаліся на навуку. З мэтай інтэнсіфікацыі навуковай работы ВНУ рэспублікі ў 1951 г. быў створаны Савет па каардынацыі навуковай дзейнасці пры АН БССР [3, арк. 84, 94]. Праз яго меркава-лася арганізацыйна з'яднаць акадэмічных навукоўцаў і выкладчыкаў ВНУ. Хаця, як правіла, педагагічныя ВНУ дастаткова фармальна падыходзілі да стварэння неабходных умоў для творчай дзейнасці сваіх выкладчыкаў. Звычайна ставілася вузкае кола навуковых праблем, звязаных з пытаннямі дакладнай вобласці. Іх вырашэнне доўжылася некалькі гадоў.

Загад Міністра вышэйшай адукацыі СССР «О мерах улучшения научно-исследовательской работы в вузах» (1956 г., красавік) адзначаў, што падрыхтоўка спецыялістаў на ўзроўні



патрабаванняў сучаснай навукі і тэхнікі не можа ажыццяўляцца без усебаковага развіцця навукова-даследчай работы ў вышэйшай школе. У 1956 г. адбылася 5-я рэспубліканская сесія па каардынацыі навуковых планаў ВНУ і даследчых інстытутаў БССР на шостую пя-цігодку (1956—1960), на якой не толькі была адзначана «вядучая роля рашэнняў XX з'езда КПСС» пры складанні навуковых планаў ВНУ на пяцігодку, але завострана ўвага на неаб-ходнасці больш цеснага ўзаемадзеяння ВНУ з акадэмічнай навукай [4, арк. 114]. Беларуская філалагічная навука ўсё больш арыентавалася на тыя запатрабаванні, якія дыктавала педа-гагічная практыка (як ВНУ, так і школ). І перш за ўсё такая практыка-арыентаваная тэматы-ка была характэрнай для выкладчыкаў ВНУ. Так, у 1957 г. у абароненых дысертацыйных даследаваннях па лінгвістыцы выкладчыкі ВНУ раскрывалі блізкасць беларускай мовы з рускай, аналізавалі актуальныя праблемы лексікалогіі беларускай мовы («Роля рускай мовы ў абагачэнні лексікі сучаснай беларускай літаратурнай мовы», «Да пытання аб народна-дыя-лектнай аснове сучаснай

беларускай нацыянальна-літаратурнай мовы», «Словаўтварэнне прыслоўя ў сучаснай беларускай літаратурнай мове» і інш.) [5, арк. 72].

У лютым 1959 г. выйшаў загад Міністра вышэйшай адукацыі СССР, у якім падкрэслівала-ся неабходнасць больш хуткага развіцця ўсіх галін навук, што забяспечваюць далейшы наву-кова-тэхнічны прагрэс. На яго падставе ўжо ў маі 1959 г. на чарговай VIII сесіі Савета па каардынацыі навуковай дзейнасці пры АН БССР ВНУ і НДУ ўзгаднілі свае планы на 1959 г. і на сямігодку [6, с. 122]. Адзначаліся недахопы ў навукова-даследчай дзейнасці па філалогіі: у БДУ, Брэсцкім, Гомельскім педінстытутах прысутнічала дубліраванне навуковай работы, а ў Віцебскім, Гродзенскім і Мазырскім педінстытутах па асобных тэмах мелі месца нерэаль-ныя планы выканання, назіраўся фармальны падыход да планавання навуковых даследа-ванняў у Брэсцкім педінстытуце. Для ўсіх ВНУ была характэрна шматтэмнасць і размерка-ванне сіл і сродкаў на выкананне вузкіх тэм. Савет, з улікам названых недахопаў, пастанавіў удакладніць вышэйшым школам і навукова-даследчым установам планы навуковай работы. Вызначаліся 30 асноўных накірункаў навуковай дзейнасці. Апошні нацэльваў на распрацоў-ку тэорыі савецкага мовазнаўства: марксісцкага вучэння аб мове як грамадскай з'яве і законах яе гістарычнага развіцця [7, арк. 65, 67]. Такім чынам, ідэалагічная састаўляючая ў чарго-вы раз дамінавала над неабходнасцю распрацоўкі праблем беларускай і рускай філалогіі ў дачыненні да практыкі выкладання ў ВНУ. Праблематыка філалагічнай навукі разглядалася праз набліжэнне беларускай філалогіі да рускай. Між тым у плане правядзення навукова-даследчай работы ў ВНУ на 1961 г. у галіне мовазнаўства прадугледжвалася вырашэнне па-сапраўднаму навуковых праблем: гісторыя і параўнальна-гістарычнае вывучэнне беларус-кай мовы ва ўзаемадзеянні з іншымі мовамі, заканамернасці развіцця народных размоўных і літаратурных моў, граматычны лад і слоўнікавы склад беларускай мовы [8, арк. 7—11].

Найбольш прадметна раскрываецца ўзаемасувязь ВНУ і НДУ ў распрацоўцы фундаментальных і практычных тэм у галіне мовазнаўства. Падчас чацвёртай пяцігодкі Інстытут літа-ратуры, мовы і мастацтва ў складзе чатырох сектараў (літаратуры, мастацтва, слоўнікавага, мовы) займаўся даследаваннем праблем, якія мелі важнае значэнне для «...сацыялістычнага культурна-нацыянальнага будаўніцтва ў БССР». Навуковая дзейнасць Інстытута развівала-ся ў накірунках распрацоўкі фундаментальных тэм па пытаннях беларускай літаратуры, бе-ларускай лексікаграфіі і гісторыі беларускай мовы і літаратуры. Праца мела мэтай падрыхта-ваць акадэмічнае выданне поўнага збору твораў класікаў беларускай літаратуры Я. Коласа і Я. Купалы, падручнік па гісторыі беларускай літаратуры, беларуска-рускі слоўнік, зборнік сістэматызаваных дыялектызмаў беларускай мовы [9, арк. 7]. У тыя гады савецкая філалогія (а значыць, перш-наперш у рамках ВНУ і НДУ) развівалася праз «новае вучэнне пра мову» ака-дэміка М. Я. Мара. «Новае вучэнне» падтрымлівалася ў процівагу буржуазным падыходам у філалогіі. У ВНУ рэспублікі на філалагічных факультэтах/аддзяленнях быў уведзены абавяз-ковы факультатыўны курс «новае вучэнне Мара». Мовазнаўчыя дысцыпліны ў ВНУ павінны



былі выкладацца зыходзячы з пазіцый гэтага акадэміка. У выкананні ўстановак «зверху» яд-нанне намаганняў выкладчыкаў ВНУ і навукоўцаў НДУ павінна было быць самым шчыльным. Напрыклад, аднымі з папулярных сумесных мерапрыемстваў некаторы час сталі юбілейныя і святочныя падзеі, так ці інакш звязаныя з самой асобай М. Я. Мара і яго «вучэннем».

У той жа час працягвалася праца над праектам беларускага правапісу, які быў прадстаў-лены на нараду Вучонага савета Інстытута мовазнаўства АН БССР толькі ў студзені 1952 г. Было адзначана, што «.блізкасць рускай і беларускай моў увесь час узрастае, таму трэба ісці па шляху ўсё большага збліжэння гэтых моў <...> Збліжэнне з рускай мовай павінна ісці на аснове агульнага для іх, а не на тым, што іх раз'ядноўвае <...> Трэба ўлічваць працы Леніна і Сталіна ў галіне мовазнаўства» [10, арк. 1, 28]. Работа па дакладным планаванні і каардына-цыі дзейнасці навуковых устаноў АН БССР з інстытутамі АН СССР і саюзных рэспублік аб'яўлялася фактычна найбольш важнай. Перад беларускім мовазнаўствам ставіўся шэраг задач, якія патрабавалі неадкладнага вырашэння. Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа, утво-раны ў 1952 г., павінен быў вырашыць тры задачы: падрыхтоўка кадраў спецыялістаў-мовaз-наўцаў; забеспячэнне ВНУ рэспублікі падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі; стварэнне абагульняючых тэарэтычных прац па розных раздзелах беларускага мовазнаўства, што са-дзейнічала б вырашэнню карэнных пытанняў мовазнаўчай тэорыі і стала б вызначальным у працы выкладчыкаў ВНУ.

У маі 1955 г. на пасяджэнні Вучонага савета Інстытута мовазнаўства былі падведзены вынікі дзейнасці. Супрацоўнікі шмат увагі надавалі складанню «Руска-беларускага» і «Бела-руска-рускага» слоўнікаў, выпускалі «Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР», дзе змяш-чаліся артыкулы па актуальных пытаннях беларускай лінгвістыкі. Слоўнікі мелі вялікае прак-тычнае значэнне для студэнтаў вышэйшай школы, настаўнікаў сярэдняй школы, грамадзян, што цікавіліся роднай мовай. Штогод вяліся

практычныя даследаванні (экспедыцыі ў летні час) па вывучэнні гаворак на ўсёй тэрыторыі БССР з мэтай стварэння фундаментальнай працы — «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы».

У 1947—1960 гг. была праведзена важная і працаёмкая работа па збіранні матэрыялаў для складання «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы»: былі сабраны звесткі аб гаворках 1170 населеных пунктаў, складзена 250 лінгвістычных карт з адпаведнымі каментарыямі. У працы прымалі ўдзел Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР, кафедры мовы БДУ імя У. І. Леніна і педагагічных інстытутаў рэспублікі пры актыўным удзеле Міністэрства асветы БССР [11, арк. 9]. У 1950-я гг. сумеснымі намаганнямі акадэмічных навукоўцаў і выкладчы-каў-філолагаў былі падрыхтаваны да друку (у першую чаргу для студэнтаў філалагічных факультэтаў) «Нарысы па гісторыі граматыкі беларускай мовы» і «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы» [12, арк. 24].

Мовазнаўцы АН БССР у 1959 г. распрацоўвалі пяць навуковых праблем (тры з якіх былі на парадку дня яшчэ з пачатку 1950-х гг.: «Гісторыя беларускай мовы», «Беларуская дыялек-талогія», «Сучасная беларуская мова»). Відавочна, што навукоўцы не маглі выканаць запла-наваны аб'ём працы, бо сур'ёзныя распрацоўкі было складана падрыхтаваць ва ўмовах пас-таяннага кантролю, абмежаваных тэрмінаў і абавязковай прапагандысцкай працы сярод насельніцтва. Тым больш што да ранейшых трох тэм былі дададзены дзве новыя: «Лексікало-гія і лексікаграфія», «Беларуская навуковая тэрміналогія». І тым не менш, бадай, самым галоўным вынікам даследчай працы сталі падрыхтаваныя да выдання 3-я частка падручніка для ВНУ «Курс сучаснай беларускай мовы», дапаможнік «Практыкаванні па курсе сучасная беларуская літаратурная мова», «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» (часткі 1, 2) і «Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі» [11, арк. 8, 9]. Гэтыя напрацоўкі далі магчымасць значна павысіць якасць выкладання беларускай мовы ў ВНУ рэспублікі.

У канцы 1950-х гг. з'явіліся і іншыя грунтоўныя вынікі навукова-даследчай дзейнасці мовазнаўцаў АН БССР. Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа ў 1957 г. падрыхтаваў «Праект



змен і ўдакладненняў у беларускім правапісе». Праект быў разгледжаны Саветам Міністраў БССР і зацверджаны ў маі 1957 г. [13, арк. 23]. На яго аснове былі распрацаваны і выдадзены ў 1959 г. «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», якія мелі практычны ўплыў на бела-рускі правапіс, фанетыку, маўленчыя аспекты, аптымізавалі працэс вывучэння беларускай мовы ў школе і ВНУ (хоць правілы так і не ахапілі ўсе спрэчныя моманты). З пачатку 1960-х гг. мовазнаўцы Інстытута пачалі работу па збору матэрыялаў для «Гістарычнага слоўніка бела-рускай мовы» (слоўнік лексікі мастацкіх, навуковых, публіцыстычных, рэлігійных, юры-дычных жанраў старажытнага беларускага пісьменства XIV—XVIII ст.), «Беларускай Са-вецкай Энцыклапедыі». Акрамя таго, працягвалася выпрацоўка асноўных правіл вымаўлен-ня ў беларускай мове і падрыхтоўка да іх першых практычных рэкамендацый.

У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС «О задачах партийной пропаганды в современных условиях» (1960 г., сакавік) было вырашана неадкладна пачаць распрацоўку тэмы «Аб заканамернасцях развіцця блізкародных нацыянальных моў у перыяд пераходу ад сацыяліз-му да камунізму» не ў канцы сямігодкі, а з 1961 г. Як адзначана ў пратаколе пасяджэння Вучонага савета АН БССР: «...такі накірунак будзе садзейнічаць выпрацоўцы мэтанакірава-нага падыходу да многіх з'яў моўнай практыкі і далейшаму развіццю і ўмацаванню інтэрна-цыянальных сувязей паміж сацыялістычнымі нацыямі». Пастанавілі правесці ў маі 1960 г. шырокую нараду выкладчыкаў мовазнаўчых кафедраў і абмеркаваць задачы павышэння культуры беларускай вуснай і пісьмовай мовы. Было вырашана з мэтай усталявання больш цеснай сувязі навуковых супрацоўнікаў Інстытута са школай усіх ступеняў прачытаць у Мінску і абласных цэнтрах даклады на тэмы: «Паходжанне і развіццё мовы», «Гісторыя ўзнікнення пісьма», «Узаемадзеянне моў у працэсе іх гістарычнага развіцця», «Літаратурная мова і народныя гаворкі» [14, арк. 27, 28]. У выніку навуковыя супрацоўнікі не толькі яшчэ больш наблізіліся ў сваёй працы да праблем ВНУ, але актыўней сталі асвятляць сярод грамад-скасці апошнія навуковыя падыходы ў галіне мовазнаўства і літаратуразнаўства.

Навукова-даследчая работа ў галіне літаратуразнаўства ажыццяўлялася праз Інстытут літаратуры і мастацтва (з 1957 г. — Інстытут літаратуры імя Я. Купалы) у цеснай сувязі з праблематыкай, што была характэрна для вышэйшай школы. Так, у другой палове 1940-х— сярэдзіне 1950-х гг. у справаздачах, даведках і іншых дакументах ВНУ адзначалася неабход-насць распрацоўкі чыста літаратуразнаўчых пытанняў (гісторыя беларускай літаратуры, бе-ларуская літаратура і яе сувязь з літаратурамі замежных краін, пытанні крытычнага і сацыя-лістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры і інш.), а таксама пытанняў метадычнага харак-тару (методыка выкладання беларускай літаратуры ў ВНУ і сярэдняй школе, распрацоўка падручнікаў, дапаможнікаў, хрэстаматый па беларускай літаратуры для ВНУ).

Пасля 1956 г. праца ў галіне літаратуразнаўства зводзілася да паглыбленага вывучэння гісторыі беларускай савецкай і дакастрычніцкай літаратуры, найважнейшых праблем сацы-ялістычнага і крытычнага рэалізму, творчасці буйных беларускіх пісьменнікаў. Другім знач-ным накірункам

з'яўлялася падрыхтоўка навуковых каментарыяў да твораў класікаў бела-рускай літаратуры і помнікаў старажытнай пісьменнасці Беларусі (збор сачыненняў Я. Купалы ў сямі тамах, збор сачыненняў Я. Коласа ў 12 тамах, складанне бібліяграфіі па беларускай літаратуры, збіранне рукапісаў беларускіх пісьменнікаў і інш.). З 1956 па 1960 г. Інстытут даследаваў праблемы гісторыі беларускай савецкай літаратуры, гісторыі дакастрычніцкай беларускай літаратуры, рыхтаваў выданні твораў класікаў беларускай літаратуры [15, арк. 11].

Такім чынам, навукоўцы Інстытута даследавалі тры комплексным праблемы: гісторыя дакастрычніцкай беларускай літаратуры (тэма «Праблема развіцця драматургічнага жанру ў беларускай літаратуры XIX ст.», канчаткова праца завершана ў 1957 г.); гісторыя беларускай савецкай літаратуры (ужо ў 1955 г. былі завершаны тэмы «Развіццё сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры перыяду 1917—1932 гг.», «Мастацкі стыль К. Чорнага 20—30-х гг.», «Сустрэнемся на барыкадах» П. Пестрака як гісторыка-рэвалюцыйны раман»); творы кла-



сікаў беларускай літаратуры (тэма завершана ў 1958 г.) [16, арк. 4, 19]. Можна канстатаваць, што распрацоўка гэтых тэм у галіне літаратуразнаўства аб'ектыўна спрыяла вырашэнню навукова-метадычных праблем філфакаў ВНУ.

Да сярэдзіны 1950-х гг. матэрыяльна-метадычная база ВНУ не спрыяла правядзенню дас-ледчай работы на высокім узроўні. Між тым запатрабаванні да сучасных характарыстык навуковых даследаванняў узрасталі, што было абумоўлена зменамі ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 1950-х гг., аднаўленнем і колькасным ростам сістэмы вышэйшай школы. Аднак Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР неаднаразова канстатавала, што ў рэгіянальных ВНУ была характэрна шматтэмнасць і размеркаванне сіл і сродкаў на выка-нанне вузкіх тэм, а таксама нерэальныя планы выканання. Тым не менш фундаментальныя навуковыя даследаванні, якія праводзіліся ў Інстытутах мовазнаўства і літаратуры АН БССР у дастаткова цесным супрацоўніцтве з выкладчыкамі ВНУ, разам з падрыхтоўкай літаратуры вучэбна-метадычнага характару, спрыялі павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-філо-лагаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей — ДАВВ). Ф. 204. Воп. 10. Спр. 1.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 4 п. Воп. 73. Спр. 18.
3. ДАВВ. Ф.. 204. Воп. 10. Спр.4.
4. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (далей — ДАМВ). Ф. 927. Воп. 1. Спр. 211.
5. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 73. Спр. 192.
6. Народное образование в СССР. 1917—1967 гг. / Министерство просвещения СССР и Академия педагогических наук СССР / редкол.: М. А. Прокофьева [и др.]. М. : Просвещение, 1967. 544 с.
7. ДАВВ. Ф. 204. Воп. 11. Спр. 54.
8. ДАМВ. Ф. 927. Воп. 1. Спр. 313.
9. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей — ЦНА НАН Беларусі). Ф. 7. Воп. 1. Спр. 25.
10. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 8.
11. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 88.
12. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 60.
13. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 64.
14. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 99.
15. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 128.
16. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 113.


## SUMMARY


Research work is one of the main aspects of the activity of the professorial staff of the universities. AS BSSR defined the directions and co-ordinate with the scientific-research work of the university though the structural elements (The universities of Language and Literature). At the same time the demands of the state grew to the modern characteristics of research. The Universities of Language and Literature thoroughly were occupied with the fundamental problems of the Belorussian philology. The research which were conducted in the 1940s-the beginning of the 1960s answered a lot of questions in the oblast of the Belorussian philology. And besides they became theoretical and factological foundation of all the teaches literature of Belorussian language / literature for different levels of education proved minds of language practice.


Статья поступила в редакцию 26 февраля 2010 г